Латыши и белорусы: вместе сквозь века. – 2018. – Вып. 7. – С. 46–54.

ИСТОРИЯ

АД ВЫБАРАЎ ДА РЭПРЭСІЙ: ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА ЛАТЫШОЎ КУЛЯЦІНА І МАТУШОВА Ў 1920-Я – ПАЧАТКУ 1930-Х ГГ.

From elections before reprisals: a legal status of Latvians of Kuliacina and Matushova in 1920 − the beginning of 1930th

К. Карпекін (K. Karpekin),
Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці
г. Віцебск, Беларусь

В 1920-е – начале 1930-х гг. население таких деревень, как Кулятино и Матушёво, расположенных на территории современного Лиозненского района Витебской области, больше чем наполовину состояло из латышей. Буквально в течение одного десятилетия их правовое положение изменилось кардинальным образом: если в начале 1920-х гг. все они являлись полноправными членами общества, то с конца 1920-х гг. к ним начали применяться меры политического и имущественного давления, что проявилось в обложении налогами хозяйств и высылке латышей в отдалённые регионы. При этом архивные источники позволяют утверждать, что местные органы власти имели чёткую цель раскулачить определённое количество хозяйств, и приговоры выносились не всегда объективно, так как в документах зафиксированы не достаточно точные сведения об имуществе латышских семей, а также противоречивые показания свидетелей.

Ключевые слова: Кулятино, латыши, Матушёво, налоги, правовое положение.

In 1920 − the beginning of 1930th the population of such villages as and Matushova located in territory of modern Liozna district of Viciebsk region, it is more than half consisted of Latvians. Their legal status is literally within one decade has changed radically: if in the early twenties all of them were full members of a society from the end of 1920th to them measures of political and property pressure have started to be applied it was showed in taxation by taxes economy and dispatch of Latvians in the remote regions. Thus archival sources allow to assert that local authorities had the accurate purpose to dispossess certain quantity of economy, and sentences were taken out not always objectively as in documents exact enough data on property of the Latvian families, and also inconsistent indications of witnesses are fixed not.

Keywords: Kuliacina, Matushova, Latvians, Liozna district, taxes, a legal status.

Узніклыя ў апошняй чвэрці XIX ст. на тэрыторыі беларускіх губерняў Расійскай імперыі латышскія калоніі працягвалі існаваць і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Да прыкладу, латышы масава пасяліліся ў дзвюх вёсках, размешчаных па суседству – Куляціне і Матушове, – якія зараз знаходзяцца на тэрыторыі Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. Па сённяшні дзень у ваколіцах згаданых населеных пунктаў захаваліся матэрыяльныя сведчанні таго, што калісьці тут пражывалі выхадцы з Латвіі: каменныя скляпы для захоўвання прадуктаў харчавання (гл. мал. 1) і помнікі на могілках (гл. мал. 2). Апроч таго, шмат звестак пра жыхароў Куляціна і Матушова маецца ў архіўных дакументах. З іх дапамогай магчыма прасачыць змены ў права-

вым становішчы латышоў, якія адбываліся на працягу дастаткова кароткага прамежку часу – ад пачатку 1920-х – да пачатку 1930-х гг.

мал. 1. Каменны склеп *мал. 2. Помнік Pauline Paukzchen*

Фота К. Карпекіна

У пачатку 1920-х гг. вёскі Куляціна і Матушова знаходзіліся на тэрыторыі Нова-Бельскага раёна Лёзненскай воласці Віцебскага павета, усяго ў межах раёна налічвалася 19 населеных пунктаў [1, арк. 124–137]. Мясцовым органам улады на акрэсленай тэрыторыі з'яўляўся Нова-Бельскі раённы Савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў. З лістапада 1923 г. адбыліся выбары, па выніках якіх у яго склад было абрана 17 сябраў. Двое з іх – латышы Іван Карлавіч Азолін і Пётр Іванавіч Цаліт – былі жыхарамі Матушова [1, арк. 121].

Неабходна адзначыць, што на той час усе без выключэння дарослыя жыхары Куляціна і Матушова мелі выбарчыя правы. Усяго ж у 1923 г. у Куляціне пражывала 18 сем'яў, у якіх налічвалася 69 паўналетніх асоб, у Матушове – 82 сям'і (227 дарослых чалавек). З іх

латышамі былі 12 сем'яў (45 чалавек) у Куляціне і 46 сем'яў (125 чалавек) у Матушове [1, арк. 123, 127, 129адв.–130, 133–135 адв.].

Сярод латышоў Куляціна найбольш шматлікай полаўзроставай групай з'яўляліся мужчыны 20–29 гадоў, затым – мужчыны 30–39 гадоў. У Матушове паводле колькасці на першым месцы знаходзіліся жанчыны ва ўзросце ад 20 да 29 гадоў, а на другім – таксама 30–39-гадовыя мужчыны (гл. табл.).

Табліца – Полаўзроставая структура латышскага насельніцтва Куляціна і Матушова, 1923 г. [1, арк. 123, 127, 129адв.–130, 133–135адв.]

Узрост	Куляціна				Матушова			
	мужчыны		*жанчыны*		*мужчыны*		*жанчыны*	
	лік	*%*	*лік*	*%*	*лік*	*%*	*лік*	*%*
18 – 19	1	4,3	2	9,1	4	6,5	5	7,9
20 – 29	7	30,4	4	18,2	8	12,9	18	28,6
30 – 39	5	21,7	3	13,6	15	24,2	13	20,6
40 – 49	2	8,8	4	18,2	9	14,5	10	15,9
50 – 59	4	17,4	4	18,2	9	14,5	7	11,1
60 – 69	1	4,3	2	9,1	14	22,6	7	11,1
70 – 79	2	8,8	3	13,6	3	4,8	3	4,8
80 – 83	1	4,3	-	-	-	-	-	-
Усяго	*23*	*100*	*22*	*100*	*62*	*100*	*63*	*100*

У сувязі з разгортваннем калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР у канцы 1920-х гг. прававое і маёмаснае становішча латышоў пагоршылася. У першую чаргу гэта праявілася ў раскулачванні самых заможных гаспадарак і абкладанні іх падаткамі. У дакументах Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці выяўлены факты раскулачвання дзвюх латышскіх гаспадарак у Куляціне і дзвюх у Матушове ў 1929–1930 гг.

У прыватнасці, раскулачванню падверглася гаспадарка Карла Карлавіча Стырны, які жыў у Куляціне. Верагодна, у некаторай ступені абкладанню падаткам сям'і К.К. Стырны паспрыяў ананімны ліст, накіраваны ў рэдакцыю віцебскай акруговай газеты "Зара Захаду" ў маі 1929 г. Аўтар ліста зазначаў, што ў згаданага селяніна маецца каля 5 дзес. (1 дзес. = 1,0925 га) няўлічанай зямлі, а падаткам абкладалася толькі 14 дзес. ворыва і 1,5 дзес. лугу. Паводле сцверджання аўтара допіса, у К.К. Стырны было 2 новыя жылыя хаты, 3 кані, 5 кароў і дробная жывёла. К.К. Стырне таксама ставілася ў абвінавачванне тое, што яго сям'я атрымлівае прыбытак ад несельскагаспадарчай працы: сам гаспадар наймаўся ў лясніцтва і вывозіў лес, кожную восень малаціў вяскоўцам збожжа (за 7 рублёў на дзень), яго сын Пётр крыў дахі ў хатах, сталярнічаў і пілаваў лес, нявестка Хрысціння была швачкай і прымала

платныя заказы. К.К. Стырна нібыта прадаваў муку і бульбу па завышаных цэнах. Таксама ён абвінавачваўся ў тым, што некаторыя яго сваякі былі сябрамі сельскага Савета і мясцовай ячэйкі УЛКСМ, з-за чаго ён своечасова і не быў абкладзены падаткам [2, арк. 5].

Для таго, каб мець уяўленне пра ўзровень матэрыяльнага дастатку раскулачваемых гаспадарак, варта згадаць, што ў сярэдзіне 1920-х гг. 43,3% сялянскіх гаспадарак мелі па 2–3 каровы, 51% гаспадарак – па 1, максімальная норма зямлі на адну гаспадарку была ўстаноўлена ў памеры 13 га. Што тычыцца цэн, то да прыкладу, у 1929 г. скураныя боты каштавалі каля 16 рублёў.

У ліпені 1929 г. сям'я К.К. Стырны складалася з 6 асоб, сярод якіх працаздольнымі з'яўляліся 1 мужчына і 3 жанчыны. Падаткам яны былі абкладзены за тое, што наймалі пастуха як для догляду за жывёлай, так і для іншых гаспадарчых спраў, а таксама іншых наёмных работнікаў, якія працавалі каля 150 дзён на год. Уся яго маёмасць і даход былі падлічаны сельскай падатковай камісіяй: зямельныя ўгоддзі складаліся з 7,25 дзес. ворыва, 9,5 дзес. луга, сад займаў 0,25 дзес., з жывёлы гаспадары трымалі 2 коней, 5 кароў, 3 свінні, 4 авечкі і казы. Апроч таго, К.К. Стырна займаўся расчысткай лясных дзялянак, вывазам лесу, разнастайнымі рамонтнымі работамі. У 1929 г. агульны прыбытак сям'і складаў 1 081 рубель 34 капейкі [2, арк. 1, 2].

Ад раскулачвання пацярпеў і брат К.К. Стырны Іван. 27 студзеня 1930 г. адбыўся сход сялян-беднякоў вёсак Куляціна і Матушова, на якім прысутнічала 26 чалавек, з якіх выказаліся 3 чалавекі. Адзін з іх зазначыў, што ў 1928 г. І.К. Стырна наймаў дарослую пастушку, а ў 1929 г. – малога пастуха, якога часам замяняў на яго старэйшага 15-гадовага брата. І летам ён не толькі пасвіў жывёлу, але яшчэ сушыў сена і капаў бульбу. Другі селянін сказаў, што ён на некаторы час даваў І.К. Стырне каня, за што той заплаціў яму пуд жыта. Паводле сведчанняў гэтага селяніна, І.К. Стырна наймаў работнікаў з суседняй Якубаўшчыны, якім плаціў за працу. Яшчэ адзін сведка сказаў, што былі выпадкі, калі за пазыку хлеба І.К. Стырне трэба было адпрацоўваць [3, арк. 6].

29 студзеня 1930 г. інспектар па сельскагаспадарчым падатку Лёзненскага раёна ажыццявіў допыт, але не самой пастушкі, а яе брата. Апошні сказаў, што яго 17-гадовая сястра ў 1928 г. наймалася як пастушка, але пераважна працавала ў І.К. Стырны на іншых сельгаспрацах [3, арк. 8].

8 лютага 1930 г. паводле пастановы падатковай камісіі І.К. Стырну абклалі індывідуальным падаткам за тое, што ён у 1928 г. наймаў дарослую пастушку на палявыя работы, нягледзячы на тое, што ў яго ў

найме была яшчэ адна працаўніца (17-гадовая пастушка), а таксама за тое, што ён пазычаў сялянам жыта, за што яны павінны былі не толькі вярнуць збожжа, але і адпрацаваць [3, арк. 1].

17 лютага 1930 г. былі апытаны пастухі, якія працавалі ў І.К.Стырны. Адзін з іх – 11-гадовы хлопец – сказаў, што ў 1929 г. ён пасвіў жывёлу, і ніякімі іншымі работамі не займаўся. Часам хлопца замяняў яго старэйшы брат. Больш таго, калі было дрэннае надвор'е, то гаспадары самі даглядалі за жывёлай [3, арк. 2]. Як бачна, гэтыя звесткі не супадаюць з афіцыйнай прычынай абкладання падаткам.

Паводле даведкі, выдадзенай Сутоцкім сельскім Саветам, І.К. Стырна меў 11,5 дзес. ворыва, 3,5 дзес. сенажаці, 2 кані, 3 каровы. Яго сям'я складалася з 4 чалавек. У 1929/1930 гаспадарчым годзе ён плаціў 143 рублі 50 капеек падатку [3, арк. 5]. На адвароце той жа даведкі пазначана, што маёмасць гэтага селяніна складалася з 7,5 дзес. ворыва, 3,5 дзес. сенажаці, 1 каня, 4 кароў, а ў сям'і налічвалася 5 едакоў. У 1927/1928 гаспадарчым годзе ён заплаціў падатак памерам 81 рубель 35 капеек [3, арк. 5 адв.]. Згодна з іншымі звесткамі, І.К. Стырна меў 9,75 дзес. ворыва, 3,5 дзес. лугу, сад плошчай 0,3 дзес., 1 каня, 3 каровы, 1 свінню, 2 авечкі. Паводле падлікаў камісіі, са сваёй гаспадаркі селянін меў даход памерам 1 128 рублёў 65 капеек штогод [3, арк. 7].

5 сакавіка 1930 г. І.К. Стырна паскардзіўся Лёзненскаму райвыканкаму на дзеянні Матушоўскай сельскагаспадарчай камуны. Па-першае, на абкладанне яго падаткам нягледзячы на тое, што ён ніколі не карыстаўся наёмнай працай, а па-другое, на канфіскацыю маёмасці. Справа ў тым, што сябры камуны рэквізавалі ў селяніна маёмасць і прадукты харчавання: 40 аршынаў (1 аршын = 71,12 см) сукна ўласнага вырабу, 12 фунтаў (1 фунт = 409,5 г) суконнай пражы, 20 суконных хустак, 3 суконныя коўдры, 3 коўдры фабрычнага вырабу, 1 футра, 5 пудоў (1 пуд = 16,38 кг) пшанічнай мукі, 1 будзільнік, чайны посуд, 2 пуды мяса, 2 венскія крэслы, 1 стол і 1 люстэрка [3, арк. 3]. Дакументаў, якія б сведчылі пра рэакцыю мясцовых органаў улады на гэтую скаргу, не выяўлена.

Што тычыцца Матушова, то тут падаткамі былі абкладзены гаспадаркі Івана Пятровіча Брэда і Паўла Паўлавіча Данцыта.

У адносінах да І.П. Брэда такія меры былі прыняты ў 1929 г. у сувязі з тым, што ён у 1928 г. наймаў на працу 17-гадовую пастушку. У ліпені 1929 г. яго маёмасць складалася з 8,2 дзес. ворыва, 3,6 дзес. лугу, 1 дзес. сада, 1 каня, 4 кароў, 1 свінні, 1 авечкі, 1 казы, 3 вулляў з пчоламі. Паводле падлікаў падатковай камісіі, даход І.П. Брэда дасягаў 1 129 рублёў 70 капеек [4, арк. 1]. У 1929 г. сям'я І.П. Брэда складалася з 6 чалавек: самаго гаспадара, яго 53-гадовай жонкі Берты, 79-гадовай

маці Лізаветы, і дзяцей − 19-гадовага сына Уладзіміра, 17-гадовай дачкі Зінаіды і 9-гадовага сына Івана. Сам І.П. Брэд не адмаўляў, што наймаў пастушку, якая займалася выключна тым, што пасвіла кароў і ў ніякіх іншых гаспадарчых справах задзейнічана не была. Пры гэтым у 1929 г. ніякіх наёмных работнікаў у яго ўжо не было [4, арк. 2 адв.].

П.П. Данцыт быў абкладзены індывідуальным падаткам паводле рашэння схода беднаты вёсак Куляціна і Матушова, які адбыўся 27 студзеня 1930 г. За абкладанне выказалася 20 чалавек, а супраць – 4. На сходзе некаторыя сяляне сцвярджалі, што П.П. Данцыт ніколі не выкарыстоўваў наёмную сілу, іншыя казалі, што ён цягам 15 гадоў наймаў аднаго з мясцовых сялян. Таксама некалькі сялян сказалі, што П.П. Данцыт пазычаў ім збожжа, грошы і не браў за гэта ніякіх працэнтаў, прадаваў збожжа па цэнах, амаль удвая меншых за рынкавыя. Затое адна сялянка прыгадала, што аднойчы П.П. Данцыт адмовіў ёй і не пазычыў хлеба [5, арк. 2].

4 лютага 1930 г. П.П. Данцыт падаў у Сутоцкую сельскую падатковую камісію скаргу, у якой растлумачыў, што парабак (беззямельны селянін) у яго быў толькі да 1915 г. і з той прычыны, што ён не меў жонкі, якая б даглядала за малымі дзецьмі. Калі ж той селянін атрымаў уласны надзел, то П.П. Данцыт даваў яму коней для яго апрацоўкі. Той, у сваю чаргу, дазволіў П.П. Данцыту на працягу года карыстацца яго лугам. Акрамя таго, у П.П. Данцыта быў пастух [5, арк. 3]. Сам П.П. Данцыт імкнуўся даказаць, што ён дасягнуў усяго ўласнымі намаганнямі: яго бацька быў звычайным батраком, які ў 1872 г. выехаў з Латвіі і пасяліўся ў в. Манулкі непадалёк ад Віцебска. Паколькі бацька не меў дастаткова сродкаў карміць дзяцей, П.П. Данцыт пайшоў служыць у армію, а затым, узяўшы пазыку ў сялянскім банку, набыў зямлю ў Матушове, дзе ўласнымі рукамі пакарчаваў лес, расчысціў зямлю для пасеваў і пабудаваў хату. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. П.П. Данцыту скасавалі пазыку, якую ён мусіў выплочваць банку, але пасля ўступлення ў сельскагаспадарчую камуну абклалі яго індывідуальным падаткам. Паводле меркавання П.П. Данцыта, гэта было зроблена наўмысна, бо яго сын некаторы час быў сябрам сельскага Савета і меў асабістых ворагаў, якія потым на сходзе і выказаліся за падатак [5, арк. 5].

Паводле словаў згаданага вышэй селяніна, ён адпрацаваў на П.П. Данцыта 17 гадоў. Калі ў 1927 г. адбылося пераразмеркаванне зямлі, то 5 дзес., што належалі заможнаму латышу, аддалі яго былому работніку. Паколькі апошні зусім не меў насення, то П.П. Данцыт дапамог яму, але восенню селянін вярнуў яму ўсё ў поўным аб’ёме. Таксама

за тое, што селянін карыстаўся коньмі П.П. Данцыта, ён аддаў яму палову атрыманага ўраджаю [5, арк. 8].

8 лютага 1930 г. на пасяджэнні згаданай камісіі было вырашана падатак не адмяняць [5, арк. 4].

Па ўсёй верагоднасці, у Сутоцкім сельскім Савеце ўлік маёмасці грамадзян вёўся не асабліва якасна. Паводле розных даведак, выдадзеных у адзін і той жа дзень – 17 лютага 1930 г., – П.П. Данцыт меў наступную маёмасць: 9,35 дзес. ворыва (паводле другой даведкі – 10,25 дзес.), 4,5 дзес. сенажаці (ці 3,5 дзес.), 2 кані, 4 каровы. Яго сям'я складалася з 5 (альбо 4) асоб. За 1927/1928 гаспадарчы год ён заплаціў 132 рублі 55 капеек падатку, а за 1929/1930 г. – 125 рублёў 26 капеек [5, арк. 1–1адв.]. Пры падліку даходнасці гаспадаркі П.П. Данцыта звесткі аказаліся зноў іншымі: у яго было ўлічана 8 дзес. ворыва, 4,5 дзес. лугу, 2 кані, 4 каровы, 1 свіння, 4 авечкі і казы, а таксама пасека на 4 вуллі. Сельская падатковая камісія ўстанавіла, што даходнасць гэтай гаспадаркі складала 1 180 рублёў непасрэдна ад сельскай гаспадаркі і 264 рублі 75 капеек – ад іншых заняткаў [5, арк. 6].

У адносінах да іншых латышоў – жыхароў дзвюх даследуемых вёсак – у пачатку 1930-х гг. прымяняліся больш жорсткія меры пакарання. Так, 15 лютага 1930 г. былі арыштаваны жыхары вёскі Куляціна Мікалай Іванавіч Стырна, Пётр Карлавіч Стырна і жыхары вёскі Матушова Адам Паўлавіч Данцыт, Іван Іванавіч Леін, Мікалай Якаўлевіч Стырна, Эдуард Іванавіч Эзэрын. Усе яны былі абвінавачаны ў антысавецкай дзейнасці і высланы на поўнач на няпэўны тэрмін. А.П. Данцыт разам з жонкай Мінай Іванаўнай і дачкой Марынай былі высланы ў Комі АССР [6, арк. 178].

У 1930 г. была раскулачана гаспадарка Пятра Пятровіча Брэда, а сам ён разам з сям'ёй сасланы ў Кайскі раён Кіраўскай вобласці [7, арк. 95].

Таксама па матывах антысавецкай дзейнасці ў маі 1933 г. на 5 гадоў зняволення ў выпраўленча-працоўных лагерах былі асуджаны Іван Іванавіч Звірбуль і Іван Іванавіч Сілабрэд з Матушова [8, с. 93].

Такім чынам, у 1920-я гг. насельніцтва такіх вёсак, як Куляціна і Матушова, больш чым, як напалову складалася з латышоў. Літаральна на працягу аднаго дзесяцігоддзя іх прававое становішча змянілася кардынальным чынам: калі ў пачатку 1920-х гг. усе яны з'яўляліся паўнапраўнымі членамі грамадства, то з канца 1920-х гг. да іх пачалі прымяняцца меры палітычнага і маёмаснага ўціску, што праявілася ў раскулачванні гаспадарак і высылцы латышоў у аддаленыя рэгіёны. Пры гэтым архіўныя крыніцы дазваляюць меркаваць, што мясцовыя органы ўлады мелі дакладную мэту раскулачыць пэўную колькасць

гаспадарак, і прысуд выносіўся не заўжды аб’ектыўна, бо ў дакументах зафіксаваны не дастаткова дакладныя звесткі пра маёмасць латышскіх сем’яў, а таксама супярэчлівыя паказанні сведак.

Выкарыстаныя крыніцы:

1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). Ф. 104. Воп. 2. Спр. 22.
2. ДАВВ. Ф. 160. Воп. 1. Спр. 135.
3. ДАВВ. Ф. 160. Воп. 1. Спр. 133.
4. ДАВВ. Ф. 160. Воп. 1. Спр. 81.
5. ДАВВ. Ф. 449. Воп. 4. Спр. 1902.
6. ДАВВ. Ф. 1966. Воп. 32. Спр. 18.
7. ДАВВ. Ф. 1966. Воп. 32. Спр. 26.
8. Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Лёзненскага раёна / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1992. – 592 с.

Дадатак

Спіс латышоў – жыхароў вёскі Куляціна, 1923 г. [1, арк. 127, 129адв –130]

Балод Аўгуст Ягоравіч (30 гадоў), Балод Ганна Іванаўна (21 год); Брэмзэ Якаў Барысавіч (55 гадоў), Брэмзэ Еўдакія Андрэеўна (42 гады), Брэмзэ Уладзімір Якаўлевіч (22 гады), Брэмзэ Анастасія Андрэеўна (23 гады); Дэйч Іван Іванавіч (38 гадоў), Дэйч Марыя Ягораўна (35 гадоў); Звірбуль Іван Марцінавіч (58 гадоў), Звірбуль Марыя Андрэеўна (58 гадоў), Звірбуль Іван Іванавіч (21 год); Лепладск Мада Іванаўна (43 гады), Лепладск Марыя Іванаўна (63 гады); Прэйс Андрэй Іванавіч (73 гады), Прэйс Эльза Марцінаўна (66 гадоў), Прэйс Пётр Андрэевіч (32 гады), Прэйс Паўліна Андрэеўна (30 гадоў), Прэйс Мілна Андрэеўна (46 гадоў); Пурман Іван Антонавіч (31 год), Пурман Паўліна Антонаўна (50 гадоў); Раманаў Карл Якаўлевіч (45 гадоў), Раманава Алена Пятроўна (79 гадоў), Раманава Караліна Фр. (35 гадоў); Стырна Аўгуст Пятровіч (32 гады), Стырна Марыя Янаўна (23 гады), Стырна Пётр Пятровіч (83 гады), Стырна Магдаліна Іванаўна (73 гады); Стырна Карл Карлавіч (57 гадоў), Стырна Мацільда Антонаўна (47 гадоў); Стырна Пётр Карлавіч (28 гадоў), Стырна Мікалай Карлавіч (27 гадоў), Стырна Марыя Карлаўна (19 гадоў), Стырна Іван Карлавіч (56 гадоў), Стырна Алена Іванаўна (45 гадоў), Стырна Аляксандр Іванавіч (20 гадоў), Стырна Мікалай Іванавіч (19 гадоў), Стырна Аляксандр Іванавіч (29 гадоў), Стырна Іван Пятровіч (78 гадоў), Стырна Хрысціна Давідаўна (73 гады); Стырна Пётр Карлавіч (60 гадоў), Стырна Алена Ягораўна (55 гадоў); Эзэрын Эрнэст Карлавіч (56 гадоў), Эзэрын Іван Эрнэставіч (25 гадоў), Эзэрын Вольга Эрнэстаўна (27 гадоў), Эзэрын Марыя Эрнэстаўна (19 гадоў).

Спіс латышоў – жыхароў вёскі Матушова, 1923 г. [1, арк. 133–135адв.]

Азолін Іван Карлавіч (38 гадоў), Азолін Ганна Юр’еўна (60 гадоў), Азолін Вольга Адамаўна (30 гадоў); Аўзін Іван Іванавіч (64 гады), Аўзін Вольга Іванаўна (20 гадоў); Балод Ягор Іванавіч (68 гадоў); Баяр Эдуард Ягоравіч (45 гадоў), Баяр Марыя Паўлаўна (31 год); Бебрыс Мікалай Міхайлавіч (43 гады), Бебрыс Наталля Карлаўна (40 гадоў), Бебрыс Хрысціна Міхайлаўна (46 гадоў), Бебрыс Хрысціна Пятроўна (27 гадоў), Бебрыс Мікалай Пятровіч (19 гадоў); Бебрыс Пётр Давыдавіч (63 гады), Бебрыс Лізавета Андрэеўна (64 гады), Бебрыс Вольга Пятроўна (27 гадоў), Бебрыс Аляксандр Пятровіч (35 гадоў); Бейшан Мада Іванаўна (50 гадоў); Берзін Пётр Якаўлевіч (72 гады), Берзін Луіза Адамаўна (56 гадоў), Берзін Іван Пятровіч (27 гадоў), Берзін Валянціна Пятроўна (18 гадоў); Блукіс Іван Фрыдрыхавіч (70 гадоў), Блукіс Ліза Іванаўна (68 гадоў); Брэд Іван Пятровіч (48 гадоў), Брэд Берта Іванаўна (44 гады), Брэд Лізавета Пятроўна (73 гады); Брэд Пётр Пятровіч (35 гадоў), Брэд Сафія Іванаўна (30 гадоў); Вейдман Рудольф (37 гадоў), Вейдман Мацільда Пятроўна (31 год); Гайліт Раман Іванавіч (60 гадоў), Гайліт Эда Іванаўна (52 гады); Грыбіс Юрый Адамавіч (50 гадоў), Грыбіс Ганна Марцінаўна (42

гады), Грыбіс Мацільда Юр’еўна (19 гадоў), Грыбіс Карл Адамавіч (48 гадоў), Грыбіс Юлія Марцінаўна (39 гадоў); Данцыт Адам Паўлавіч (54 гады), Данцыт Міна Іванаўна (46 гадоў), Данцыт Іван Адамавіч (20 гадоў); Данцыт Аляксандр Паўлавіч (54 гады), Данцыт Ганна Андрэеўна (41 год); Данцыт Павел Паўлавіч (57 гадоў), Данцыт Алена Якаўлеўна (52 гады), Данцыт Іван Паўлавіч (19 гадоў); Ірбелек Якаў Іванавіч (60 гадоў), Ірбелек Міна Якаўлеўна (30 гадоў); Кальнет Іван Паўлавіч (29 гадоў), Кальнет Павел Андрэевіч (62 гады), Кальнет Мільда Раманаўна (22 гады); Клявін Андрэй Іванавіч (34 гады), Клявін Марыя Якаўлеўна (28 гадоў); Кюз Адам Францавіч (63 гады), Кюз Кацярына Янаўна (26 гадоў); Лесцін Бернуль Якаўлевіч (36 гадоў), Лесцін Міна Паўлаўна (38 гадоў); Лесцін Іван Іванавіч (58 гадоў), Лесцін Марыя Карлаўна (38 гадоў), Лесцін Іван Карлавіч (31 год); Лігер Аўгуст Ягоравіч (51 год); Мейзас Аляксандр Пятровіч (31 год), Мейзас Хрысціна Пятроўна (26 гадоў), Мейзас Пётр Раманавіч (72 гады), Мейзас Хрысціна Якаўлеўна (65 гадоў); Муцэнек Мілда (23 гады); Осіс Юліус Сямёнавіч (36 гадоў), Осіс Кацярына Іванаўна (28 гадоў); Паўкшын Уладзімір (40 гадоў), Паўкшын Паўліна Паўлаўна (35 гадоў), Паўкшын Бернат Адамавіч (56 гадоў), Паўкшын Аўгуст Адамавіч (48 гадоў), Паўкшын Ганна Іванаўна (47 гадоў); Прэйс Карл Якаўлевіч (60 гадоў), Прэйс Лізавета Пятроўна (55 гадоў), Прэйс Іван Карлавіч (27 гадоў), Прэйс Алена Карлаўна (19 гадоў); Пурвін Аляксандр Іванавіч (29 гадоў); Рамел Паўліна Іванаўна (45 гадоў), Рамел Сафія Марцінаўна (21 год); Рамс Пётр Іванавіч (68 гадоў), Рамс Ліза Якаўлеўна (66 гадоў), Рамс Эдуард Пятровіч (32 гады), Рамс Хрысціна Пятроўна (32 гады); Рудзіт Міна Іванаўна (24 гады); Сапул Іван Іванавіч (68 гадоў), Сапул Эда Андрэеўна (76 гадоў); Свіклін Іван Пятровіч (40 гадоў), Свіклін Караліна Іванаўна (38 гадоў); Свіклін Пётр Іванавіч (64 гады), Свіклін Пётр Пятровіч (37 гадоў), Свіклін Атылія Іванаўна (28 гадоў); Сілабрэд Іван Іванавіч (45 гадоў), Сілабрэд Алена Іванаўна (34 гады); Страус Мацільда Іванаўна (18 гадоў); Стырна Іван Іванавіч (40 гадоў), Стырна Ева Іванаўна (36 гадоў); Стырна Якаў Пятровіч (56 гадоў), Стырна Марыя Паўлаўна (45 гадоў), Стырна Хрысціна Якаўлеўна (29 гадоў), Стырна Мікалай Якаўлевіч (19 гадоў); Тальман Якаў Юр’евіч (62 гады), Тальман Мацільда Эрнстаўна (42 гады); Танцлаў Якаў Іванавіч (55 гадоў), Танцлаў Хрысціна Іванаўна (50 гадоў), Танцлаў Іван Якаўлевіч (37 гадоў), Танцлаў Марыя Іванаўна (27 гадоў); Танш Карл Барысавіч (69 гадоў), Танш Іван Карлавіч (32 гады), Танш Міла Пятроўна (26 гадоў), Танш Лізавета Іванаўна (60 гадоў), Танш Андрэй Карлавіч (24 гады), Танш Сафія Карлаўна (23 гады), Танш Міла Карлаўна (26 гадоў); Цаліт Пётр Іванавіч (29 гадоў), Цаліт Марыя Пятроўна (25 гадоў), Цаліт Мада Пятроўна (72 гады); Цыгус Юліус (35 гадоў); Шмідрэ Пётр Рэйнавіч (65 гадоў), Шмідрэ Ева Іванаўна (61 год), Шмідрэ Іван Пятровіч (30 гадоў), Шмідрэ Альвіна Пятроўна (25 гадоў); Эзэрын Эдуард Іванавіч (25 гадоў), Эзэрын Эмілія Індрыкаўна (56 гадоў), Эзэрын Іван Іванавіч (18 гадоў).

Заўвага: у спісах асобныя сем’і падзелены паміж сабой знакам “;”